# У гады ваеннага ліхалецця

Экскурсія па экспазіцыі музея Шылавіцкай СШ

Вялікай Айчыннай вайна – самая трагічная старонка гісторыі нашага народа. Наша мясцовасць была акупіравана ў першыя ж дні вайны. Па ўстаноўленаму фашысцкай Германіяй адміністрацыйнаму падзелу яна уключалася ў акругу Беластoк . Пачаліся гады акупацыі. У Шылавічах стаяў вялікі нямецкі гарнізон.



Згодна з планам Ост, частка наесльніцтва  СССР, павінна была стаць рабамі  ў нямецкіх гаспадароў. Людзей хапалі  і вывозілі на прымусовыя работы ў Германію. Усяго па Шылавіцкаму сельскаму Савету было вывезена 75 чалавек. Назад вярнуліся толькі 36 чалавек.




Вось такія знакі адрознення павінны былі насіць нашы землякі на чужыне

Як страшны сон успамінае  Вераніка Іосіфаўна Пашкоўская (нар. ў 1925 г.) два гады праведзеныя ва Усходняй Прусіі. Летам 1942 г. яна была адпраўлена на прымусовыя работы ў Германію.На плечы шаснаццацігадовага падлетка лёг увесь цяжар паднявольнай працы.






Такія пашпарты выдаваліся мясцовым жыхарам на акупіраванай тэрыторыі. Разам з фотаздымкам, апісанне знешнасці

- Але народ не скарыўся. У музейнай калекцыі – некалькі экзэмпляраў газеты “Раздавім фашысцкую гадзіну”. Гэта газета распаўсюджвалася сярод воінаў Чырвонай арміі і на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Яна падымала баявы дух і ўсяляла надзею на перамогу ў вайне.




32 нумар газеты выдадзены ў лютым 1942 г. у час разгрому немцаў пад Масквой

Усе друкаваныя выданні ваеннага часу захаваліся ў мясцовых жыхароў і былі знойдзены ў наш час выпадкова.



Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# РАЗДАВИМ фашистскую ГАДИНУ

№ 8. АГИТПЛАКАТ, ИЗДАНИЕ ГАЗЕТЫ „ЗВЕЗДА“, ОРГАН ЦК КП(б)Б. ИЮЛЬ 1941 г.

## Сержант Подольный

Привет бойцу, кто храбро взвился в воздух,
Кто рвется в бой на славные дела.
Недаром пару крыльев краснозвездных
Ему для битвы родина дала.

Таков и он, герой—сержант Подольный.
Ему отчизна наша дорога.
За свой народ, в защиту жизни вольной
Он самолет бросает на врага.

Он с яростью летит неистребимой.
Войска фашистов. Бомбы в цель легли,
И виден только столб огня и дыма,
Где раньше танки вражеские шли.

## Чего Гитлер хочет...

Помещика крестьянину на шею посадить,

Заводы в собственность буржуев превратить.



ВЕТОВ
ПУТАТОВ
ДЯЩИХСЯ
СССР

Красная Армия героически защищает честь, свободу и независимость нашего Отечества от немецко-фашистских захватчиков!
Дух великого Ленина и его победоносное знамя вдохновляют нас на Отечественную войну.
Под знаменем Ленина—Сталина, вперед к победе!

ороны

Гналі немцы- афіцэры
Як быдлё сваіх салдат
На зімовыя кватэры
У Маскву і Ленінград.
На фашысцкі брэх і
крык
Адказаў савецкі штык:
- Калі ласка! Вам
кватэры?
Ад сяла і да сяла
Для салдат і афіцэраў
Бура снегу намяла.


Лютэ 1942 г.
АГІТПЛАКАТ, ВЫДАННЕ ГАЗЕТЫ „СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"—ОРГАН ЦК КП(б)Б
№ 32

НЯХАЙ ЖЫВЕ СВАБОДНАЯ БЕЛАРУСЬ!

УЗНІМАЙСЯ, НАРОДЗЕ МОЙ, НА ВЯЛІКУЮ РАСПЛАТУ

(Са звароту народнага паэта БССР Янкі Купалы да беларускага народа)

БЕЛАРУСЫ, БРАТЫ І СЁСТРЫ МАЕ! ВЯЛІКІ НАШ ПАЛКАВОДЗЕЦ, МУЖНЫ ВОЖДЗЬ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ СТАЛІН ВЫВЕЎ СЛАЎНУЮ НАШУ ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ І ЎСЮ НАШУ КРАІНУ НА ВЯЛІКІЯ СПРАВЫ, НА ВЯЛІКІ РАЗГРОМ ГІТЛЕРАЎСКІХ ПОЛЧЫШЧ. ПАЧАЛАСЯ ВЯЛІКАЯ І БЯЗЛІТАСНАЯ РАСПЛАТА З ПОДЛЫМІ ЗАХОПНІКАМІ. НА НАШАЙ ЗЯМЛІ ЗНАЙШЛІ САБЕ МАГІЛЫ ЗВЫШ ШАСЦІ МІЛЬЁНАЎ НЕМЦАЎ. БАНДЫ ГІТЛЕРАЎСКІХ ВАЯК УЖО КОЦЯЦЦА З СОВЕЦКІХ ЗЕМЛЯЎ, УСЦІЛАЮЧЫ ДАРОГІ ДЗЕСЯТКАМІ ТЫСЯЧ ТРУПАЎ ШТОДЗЕНЬ І ПАЛІВАЮЧЫ НАШЫ ПАЛІ СВАЁЙ ПАГАНАЙ КРЫВЁЮ. ЯНЫ ХАЦЕЛІ ЎЗЯЦЬ МАСКВУ, А ЗНАЙШЛІ ПАД МАСКВОЙ СВАЮ ПАГІБЕЛЬ І ПАЧАТАК СВАЙГО ГАНЕБНАГА КАНЦА.

І Ў ГЭТЫ ЧАС РАСПЛАТЫ З ВОРАГАМ ВЫ ПАВІННЫ ПАМЯТАЦЬ, ШТО СВЯТЫ АБАВЯЗАК НАШ ПЕРАД РАДЗІМАЙ — ЯШЧЭ БОЛЬШ ЯК КАЛІ ПОМСЦІЦЬ ВОРАГУ БЕЗ КАНЦА І БЕЗ МЕРЫ. ПАМЯТАЙЦЕ — НІВОДЗІН НЕМЕЦ НЕ ПАВІНЕН ВЫЙСЦІ ЖЫВЫМ З НАШАЙ ЗЯМЛІ. РАБІЦЕ СМЕРЦЬ КОЖНАМУ З ІХ. ПРАЗ НАШУ БЕЛАРУСКУЮ ЗЯМЛЮ НЕДАБІТЫЯ НЯМЕЦКІЯ ЗГРАІ БУДУЦЬ КАЦІЦЦА Ў СВАЮ ГЕРМАНІЮ. НЕ ПАВІННЫ ЯНЫ ДАЙСЦІ КУДЫ БУДУЦЬ ХАЦЕЦЬ. УСЕ ЯНЫ ПАВІННЫ ПАЛЕГЧЫ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ.

ПЛЯСКА ПЕРАД СМЕРЦЮ

Рэчы, якія пакінула нам вайна: штык ад знакамітай вінтоўкі Мосіна, з якой рускі салдат прайшоў некалькі войнаў, а савецкі пачынаў Вялікую Айчынную, кабура ад пісталета , каска і біклага чырвонаармейца





Астаткі боепрыпасаў, што руйнавалі нашу зямлю, забівалі людзей, каска нямецкага салдата

Некаторыя нашы землякі змагаліся у радах савецкай і польскай армій. Нікога з іх ўжо няма ў жывых. Але нам засталіся ўспаміны гэтых людзей



# Вялесік Іван Георгіевіч

*Усё сваё жыццё, за выключэннем ваенных і пасляваенных год пражыў у вёсцы Бегені. Шмат цікавага і трагічнага ўспамінае Іван Георгіевич. Як у складзе 27 пяхотнага палка Польскай Арміі Людовай удзельнічаў у Вісла-Одэрскай аперацыі, як ледзь не патануў разам са сваім "максімам" пры пераправе праз Одэр, як трапіўшы ў акружэнне пад суцэльным агнём праціўніка прарываліся да сваіх некалькі дзён. У жывых засталіся са 115 толькі 27 чалавек.*



# Варвара Аляксееўна Ягнешка



**З вясны 1944 г. служыла санінструктарам у аўтасанроце №3 у складзе 1-га Беларускага фронта. Удзельнічала ў аперацыі «Баграціён», у баях за Усходнюю Прусію, у вызваленні Польшчы. Вайну завяршыла ў Германіі, на Эльбе.**



У горадзе Вітцендорфе

# **Пякарскі Марьян Станіслававіч** і яго ўзнагароды.

*Медалі за Одэр, Нейсэ, Балтыку, за узяцце Варшавы, Грунвальдская адзнака…*









Цікавы дакумент – дазвол на валоданне 10 гектарамі зямлі і гаспадаркай на былых нямецкіх тэрыторыях, што сталі пасля вайны належаць Польшчы. Такі дакумаент даваўся салдатам Польскай Арміі, асабліва з нашых тэрыторый.

# Шырэй Елізавета Васільеўна

**Нарадзілася ў 1927 г. ў падмаскоўным г. Бораўск восенню-зімой 1941 – 1942 гг. Перажыла трохмесячную акупацыю ў час Маскоўскай бітвы. Пасля вызвалення ўдзельнічала ў аднаўленні горада. Да канца вайны працавала на фабрыца па пашыве адзення і абутку для салдат.**



**Шылавічы, як і ўвесь Ваўкавыскі раён вызвалялася ў ліпені 1944 г. Баі за нашу вёску і наваколле былі вялікімі. Змагаліся тут часці 169 Рагачоўскай стралковай дывізіі. Салдаты гэтай дывізіі прайшлі слаўны шлях абараняючы Украіну, удзельнічалі ў Сталінградскай і Курскай бітвах, у аперацыі "Баграціён", пазней вызвалялі Усходнюю Прусію і Польшчу, удзельнічалі ў Берлінскай аперацыі. Многім воінам гэтай слаўнай дывізіі было наканавана загінуць вызваляючы нашу мясцовасць. У асноўным гэта салдаты 680 стралковага палка.**



- Пасля вайны адбылося перазахаванне астанкаў савецкіх воінаў і партызан, што загінулі вызваляючы Шылавічы  і суседнія вёскі. У 1948 годзе на магіле быў пастаўлены помнік.





У 90-х гадах помнік быў рэканструяваны.

У брацкай магіле пахаваны 287 воінаў і партызан. Імёны толькі 65 з іх вядомы.






Намаганнямі вучняў і настаўнікаў Шылавіцкай школы была праведзена вялікая пошукавая работа, знойдзены сваякі некаторых воінаў, загінуўшых за нашу мясцовасць.



М.А.Басалкевіч ля магілы бацькі



Гэты дакумент, так званая “пахаронка”. Страшней гэтай весткі для родных і блізкіх не магло быць нічога.



144-й
ОТДЕЛЬНЫЙ МЕДИКО-
САНИТАРНЫЙ БАТАЛЬ-
ОН, 23 октября 1944 г.

И З В Е Щ Е Н И Е № 214

Ваш муж рядовой ЕМЕЛЬЯНОВ Максим Иванович, уроженец Амурской области, Бурейский район, д. Черниговк[а] в бою за социалистическую Родину, верный воинской присяг[е] проявив геройство и мужество, был ранен и умер от ран 22 октября 1944 года.

Похоронен на Православном кладбище, Девятковского с/Совета, Волковыского района, Гродненской области.

Настоящее извещение является документом для возбуждения ходатайства о пенсии .

Командир 144 МСБ
капитан - ОВЧИННИКОВ

печать МСБ

Копия верна: Врио Бурейского райвоенкома
капитан -
(ВАЛЬЧЕНКО)


Здесь захоронено 284 воина
погибших в июле 1944 года.
ВЕЧНАЯ ПАМЯТЬ ГЕРОЯМ

# Бакін Сяргей Рыгоравіч

**Загінуў вызваляючы вёску Шылавічы. Пахаваны ў брацкай магіле. Яго сям'я прыязжала з Арла праз 68 год пасля вайны**



**Трэба мужнымі быць у жыцці,**

**Памятаць кожны дзень і гадзіну:**

**Жыць на свеце – не поле прайсці,**

**Мы ў адказе за мір, за Радзіму**